# ГАСПАДАРЫ СВАЙГО ЛЁСУ, УДЗЯЧНЫЯ СПАДЧЫННІКІ

## Беларусь адзначыла Дзень Незалежнасці

**Амаль тры дзесяцігоддзі 3 ліпеня — у гадавіну вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — мы святкуем Дзень Рэспублікі, сваё галоўнае дзяржаўнае свята, сімвал суверэнітэту, міру і свабоды, росквіту і веры ў будучыню. Свята, у якім спалучылася ўсё: памяць і надзея, гонар і падзяка...**




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

### Пад прамянямі дабрыні

**Дзень Незалежнасці Брэст адзначыў маштабнымі народнымі гуляннямі. Адно з іх прайшло ў мікрараёне Рэчыца напярэдадні. Жыхары і госці сабраліся на стадыёне сярэдняй школы № 27. Ганаровым госцем свята стаў ветэран Вялікай Айчыннай вайны Пётр Светкін.**

Асаблівыя словы павагі і пашаны ад імя ўсіх прысутных адрасавала ветэрану **намеснік кіраўніка адміністрацыі раёна Святлана КАЗЛОВІЧ.** На свяце ўшанавалі сем'і, найлепшых працаўнікоў прадпрыемстваў раёна, працавалі выстаўкі, дзіцячыя атракцыёны, прайшоў фестываль дваровых гульняў, адбыўся вялікі святочны канцэрт.

Фестываль адпачынку ў цэнтральным брэсцкім парку назвалі «Сямейны пікнік «Прамяні дабрыні». Сюды прыйшлі гараджане сем'ямі. Забаўлянак было на любы густ. Сапраўдная гульнявая раскоша чакала дзяцей. На траве размясціліся шатрыпалаткі, дзе можна было адпачыць, падсілкавацца, пагуляць у сямейным коле. А хто жадаў далучыцца да калектыўных гульняў, паўдзельнічаць у конкурсах, атрымаў такую магчымасць. Усім было весела. Завяршыўся фэст «Прамяні дабрыні» канцэртам і феерверкам.

Мерапрыемствы праходзілі на розных пляцоўках ва ўсіх раёнах горада. Напрыклад, у канферэнцзале Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя А. С. Пушкіна адбыўся літаратурна-музычны вечар «Квітней, Беларусь!»

Па даўняй традыцыі святкаванне Дня Незалежнасці ў Брэсце пачынаецца акцыяй ускладання кветак да помніка «Вызваленне». Пакланіцца подзвігу вызваліцеляў прыйшлі кіраўнікі горада і вобласці, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, моладзь. Кветкі да падножжа манумента ўсклалі старшыня Брэсцкага гарвыканкама Сяргей Лабадзінскі і старшыня гарадскога Савета дэпутатаў Мікалай Красоўскі.

Гадзінай пазней людзі сабраліся на плошчы Цырыманіялаў у Брэсцкай крэпасці, каб хвілінай маўчання ўшанаваць памяць абаронцаў цытадэлі і ўсіх воінаў, якія загінулі за Радзіму ў Вялікай Айчыннай вайне. Воіны Брэсцкага гарнізона прайшлі ўрачыстым маршам уздоўж некропаля і манумента «Мужнасць». Да Вечнага агню былі ўскладзены вянкі і кветкі.

— У Брэсцкай крэпасці мы як нідзе разумеем каштоўнасць нашай незалежнасці, — сказаў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.** — Менавіта сюды мы прыходзім у свята, каб аддаць належнае ваеннаму пакаленню за тое, што маем сваю дзяржаву, эканамічна ні ад кога не залежым. Мы будуем жыллё, бальніцы, школы, паляпшаем дабрабыт людзей, а гэта і ёсць падмурак нашай незалежнасці. Нам, беларускаму народу, ёсць што святкаваць у гэты дзень. Той, хто разумее беларусаў, заўсёды будзе мець надзейных сяброў.

Усяго ў крэпасць прыйшло каля 4 тысяч чалавек. А ў 12 гадзін у Свята-Мікольскім гарнізонным храме ў Брэсцкай крэпасці прагучала малітва за Беларусь. У гэты ж час ад пляцоўкі каля галоўнага ўвахода ў Брэсцкую крэпасць стартаваў аўтапрабег да Алеі памяці ў гарадскім пасёлку Мухавец.

Вялікая канцэртная праграма чакала гледачоў каля гандлёвага цэнтра «Экватар». З раніцы тут працавала выстаўка ўзбраення і ваеннай тэхнікі вайсковых часцей Брэсцкага гарнізона.

Вячэрні канцэрт у крэпасці завяршыўся акцыяй «Спяём гімн разам».



Фота БелТА.

Брэст.

### Рост на фоне няпростых умоў

**У Віцебску свята пачалося з мітынгу на мемарыяльным комплексе ў гонар савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў Віцебшчыны. Удзячныя нашчадкі герояў-вызваліцеляў усклалі вянкі і кветкі да Вечнага агню.**

«Дзень Незалежнасці — адно з нашых самых светлых свят. Жыць сваім розумам, самім прымаць рашэнні і рабіць нашу краіну лепей, незалежна ад таго, хто б нам ні пагражаў звонку, — гэта і ёсць незалежнасць», — звярнуўся да жыхароў і гасцей горада **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.**

Ён адзначыў, што ў даце 3 ліпеня шмат асабістага, перажытага і блізкага ўсім беларусам. Дзень Незалежнасці праз доўгія шчаслівыя гады пад чыстым небам нязменна вяртае ў адзін з самых цяжкіх і гераічных перыядаў. Каласальная адвага спатрэбілася ад нашых дзядоў і прадзедаў, каб адстаяць незалежнасць і самабытнасць у гады Вялікай Айчыннай вайны. Наш народ мужна адбіваў атакі захопнікаў, праліваў кроў на франтах, у партызанскіх атрадах і падпольных ячэйках. Мы не маем права забываць тых, хто даў нам свабоду.

«Нам выпала місія захаваць мір, заваяваны мільёнамі жыццяў нашых герояў, у цяжкі момант падставіць плячо, у тым ліку сваім суседзям. З нашай зямлі ніколі не сходзіла і не будзе сходзіць агрэсія. Але гэта не значыць, што мы не можам за сябе пастаяць. Чужога нам не трэба, але і свайго не аддадзім! Так навучылі нас продкі. І мы будзем верныя іх запавету», — падкрэсліў кіраўнік паўночнага рэгіёна.



Фота БелТА.

Віцебск.

Губернатар расказаў пра ўклад Віцебшчыны ў агульнае высокае развіццё краіны. Так, на фоне няпростых эканамічных умоў вобласць забяспечвае рост экспарту тавараў і паслуг. Кожны чацвёрты тавар, які экспартуецца, адносіцца да высока- і сярэднетэхналагічнай прадукцыі. 97 краін свету супрацоўнічаюць з арганізацыямі вобласці, прадукцыя экспартуецца ў 66 дзяржаў. «Прытрымліваючыся міралюбівай шматвектарнай палітыкі і ўзаемавыгаднага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, мы здабылі партнёраў у розных пунктах планеты, асвоілі новыя рынкі, сталі ініцыятарам і надзейным удзельнікам буйных інтэграцыйных працэсаў. Усё, што зроблена сёння на Віцебшчыне і ў Беларусі ў цэлым, нязменна асацыіруецца са знакам самай высокай якасці», — адзначыў старшыня аблвыканкама.

Таксама кіраўніцтва вобласці, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і ўстаноў, жыхары і госці горада ўсклалі кветкі да помніка Пятру Міронавічу Машэраву — славутаму партызану і выдатнаму кіраўніку савецкай Беларусі.

### Прыклад папярэдніх пакаленняў

**Тое, наколькі папулярны і прэстыжны ўдзел ва ўрачыстых шэсцях, чарговы раз паказаў Гомель 3 ліпеня. Больш за 8 тысяч жыхароў горада прайшлі святочным парадам. Узначалілі калону старшыня аблвыканкама Іван Крупко, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Сяргей Барташ, старшыня абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Зенкевіч.**

Падчас мітынгу каля Вечнага агню на плошчы Працы прайшла цырымонія ўшанавання памяці загінулых савецкіх воінаў і падпольшчыкаў.

Па традыцыі словы віншавання ў Дзень Незалежнасці і свой наказ маладому пакаленню як Гомельшчыны, так і ўсёй краіны перадала **ветэран Вялікай Айчыннай вайны** знакамітая гамяльчанка **Аэліта САМСОНАВА.**

— Цяпер, у гэты няпросты час, мы, дарагія мае, павінны стаць апорай Радзімы і ўносіць часцінку душы і розуму ў развіццё эканомікі. Любіце сваю краіну, — заклікала ветэран.

**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО** павіншаваў беларусаў з датай вызвалення Радзімы і таксама заклікаў самаадданай штодзённай працай праслаўляць нашу краіну: «Тут нам у прыклад пасляваеннае пакаленне, на плечы якога выпала цяжкая ноша... Аднаўленне разбуранай вайной народнай гаспадаркі патрабавала тытанічных намаганняў».

Кіраўнік рэгіёна вітаў пераможцаў абласнога конкурсу «Чалавек года».

— З 2009 года на Гомельшчыне прысуджаецца высокае званне «Чалавек года». За гэты час ушанаваныя звыш 80 паважаных жыхароў рэгіёна. Іх імёны занесены ў кнігу «Чалавек года», практычна пра кожнага зняты дакументальныя фільмы, — звярнуў увагу губернатар. — Калі да сённяшняга дня колькасць пераможцаў конкурсу заставалася нязменнай — сем — па колькасці намінацый, — то з гэтага года пры той жа колькасці намінацый мы ўшаноўваем ужо 24 нашы землякі.

Сярод тых, хто ўдастоены ганаровага звання, — абаронца дзяржаўнай граніцы, намеснік пракурора і ветэран вайны ў Афганістане, кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў, трактарыст і аператар машыннага даення, пісьменнік, спартсмен і народны майстар.

Падарункам да Дня Незалежнасці на Гомельшчыне стала і адкрыццё першага ў рэгіёне дома, дзе прадугледжаны кватэры для ваеннаслужачых. У галоўнае свята краіны амаль 40 сем'яў атрымалі ключы ад новага жылля.




Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

Гомель.

Між тым Гомельшчына падчас святкавання Дня Незалежнасці актыўна падтрымала і агульнарэспубліканскія святочныя традыцыі. Інфармацыйна-асветніцкая акцыя «Дарогамі мужнасці і стойкасці: раўненне на герояў» 1 ліпеня сабрала розныя пакаленні гамяльчан каля помніка братам Лізюковым на плошчы Перамогі.

### Падмурак, на якім мы будуем

**Прадстаўнікі 30 прадпрыемстваў і ўстаноў Гродна прадэманстравалі свае дасягненні падчас урачыстага шэсця. Святочная калона прайшла па цэнтральнай гарадской вуліцы, якая злучае дзве плошчы.**

На плошчы Леніна з прывітальным словам выступіў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК.** Ён заўважыў, што Беларусь дэманструе ўсяму свету адзінства, высокі патрыятызм, вернасць і адданасць памяці продкаў, натхняе на пераадольванне любых цяжкасцяў і надае ўпэўненасць у шчаслівай будучыні.

— Незалежнасць — найважнейшы фактар развіцця і росквіту любой дзяржавы. Але кожны народ напаўняе гэта паняцце асаблівым сэнсам з улікам нацыянальных каштоўнасцяў і асаблівасцяў. Для нас, беларусаў, аснова незалежнасці — вызваленне. Галоўнае дзяржаўнае свята мы звязваем з датай вызвалення сталіцы нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у далёкім 1944 годзе, — зазначыў губернатар Гродзенскай вобласці.

Уладзімір Каранік падкрэсліў, што беларусы — самадастатковая нацыя, якая мае слаўную шматвекавую гісторыю, самабытную культуру і багатыя традыцыі. Беларусам ёсць што берагчы. Кіраўнік рэгіёна ўзнагародзіў найлепшых прадстаўнікоў рэгіёна.




Фота БелТА.

Гродна.

### Нагода для радасці

**На Магілёўшчыне святочная праграма пачалася на Буйніцкім полі. З раніцы тут было шматлюдна. Людзі прыйшлі са сцягамі, кветкамі, узнёслым настроем.**

— Гэта вялікае свята азначае нязломнасць духу і імкненне адстойваць непарушныя прыярытэты беларускай дзяржавы, — адзначыў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.** — Невыпадкова мы пачынаем нашы святочныя мерапрыемствы на гэтым знакавым для беларусаў месцы. Мы схіляем галовы перад гераічным подзвігам пакалення пераможцаў і дзякуем за магчымасць жыць у свабоднай краіне. Хацелася б, каб наша моладзь ніколі не забывала, як была заваяваная Перамога.

У горадзе і вобласці адбылося шмат розных мерапрыемстваў. У Магілёве, на пляцоўцы каля гарадскога фізкультурна-спартыўнага клуба па вуліцы Сурганава, было арганізавана сямейнае свята «Мама, тата, я — спартыўная сям'я». Дзіцячая забаўляльная спартыўна-адукацыйная пляцоўка «Ганаруся сваёй краінай» працавала ў Падніколлі. Там гледачоў сустракалі святочнай канцэртнай праграмай. Далучыцца да творчасці навучэнцаў гімназіі-каледжа можна было на адкрытай пляцоўцы па вуліцы Крыленкі каля корпуса № 2 гэтай установы. На пешаходнай вуліцы Ленінскай каля Магілёўскага каледжа мастацтваў адбыўся канцэрт «Са святам, любімая краіна!»...

Святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню горада Магілёва і Дню Незалежнасці, праходзілі на Магілёўшчыне на працягу некалькіх дзён. У Магілёве адбылося адкрыццё гарадской Дошкі пашаны і алеі гарадоў-пабрацімаў, прэзентацыя тэатральнага сквера з арт-аб'ектамі ў выглядзе музычнай лаўкі і літаратурнай альтанкі.

Шмат прыемных падарункаў да свята атрымалі жыхары Магілёўскага раёна. У Буйнічах адкрыўся першы ў гэтым раёне электрадом на 37 маладых сем'яў, сярод якіх 33 — шматдзетныя. Побач з домам — дзіцячая пляцоўка з мяккім пакрыццём і сучасным гульнявым абсталяваннем. Дзіцячыя пляцоўкі са шматфункцыянальным абсталяваннем адкрыліся таксама ў аграгарадках Палыкавічы і Межысеткі. Удзел у добраўпарадкаванні пляцовак прымалі спонсары і мясцовыя жыхары.

На тэрыторыі Буйніцкай сярэдняй школы адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэння ключоў ад новых школьных аўтобусаў і адкрыццё пасля рэканструкцыі школьных майстэрань.

Па ініцыятыве Магілёўскага райвыканкама на чале са старшынёй Алегам Чыкідам ва ўсіх аграгарадках Магілёўскага раёна 3 ліпеня адбылося ўрачыстае адкрыццё пляцовак дзяржаўнай сімволікі з удзелам прадстаўнікоў органаў улады, дэпутатаў, працоўных калектываў і навучэнцаў.



Фота БелТА.

Магілёў.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

У Мінску кіраўніцтва горада і жыхары сталіцы ўсклалі кветкі да абеліска на плошчы Перамогі.

### Ідэя міру — у цэнтры ўрачыстасцяў

**Шмат людзей сабралі святкаванні ва ўсіх кутках Мінскай вобласці. Жыхары цэнтральнага рэгіёна прыйшлі ўшанаваць тых, хто загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны, хвілінай маўчання, ускласці кветкі да абеліскаў, месцаў масавых пахаванняў.**

Падарунак жыхарам Крупак — будынак новага раённага суда. У цырымоніі адкрыцця аб'екта прынялі ўдзел **старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр Турчын і старшыня Вярхоўнага Суда Беларусі Валянцін СУКАЛА.**

— У мяне да судовай сістэмы асаблівае стаўленне, бо людзі ідуць сюды па аднаўленне справядлівасці. Хачу падзякаваць усім, хто мае дачыненне да будаўніцтва Палаца правасуддзя, і асабліва Валянціну Алегавічу Сукалу. Упэўнены, разам мы вырашым праблемы і ў іншых рэгіёнах вобласці, — адзначыў Аляксандр Турчын.

Дзяржынск па традыцыі адзначыў адразу дзве знамянальныя падзеі: Дзень Незалежнасці і Дзень горада. Праграма была разнастайная: урачысты мітынг, шэсце, ускладанне кветак, народныя гулянні, выстаўкі, гістарычныя рэканструкцыі, кірмаш рамеснікаў. Пасля вялікага канцэрта ўвечары — гімн і феерверк.

У Вілейцы прадоўжылася акцыя «Паштоўка ветэрану». Разам з віншаваннямі, пажаданнямі добрага здароўя прадстаўнікі сацыяльных службаў і грамадскіх арганізацый уручылі шаноўным землякам кветкі і падарункі.

У Клецку, апроч іншага, — выстаўка падворкаў, спаборніцтвы і фестываль патрыятычнай песні.

Губернатар таксама паведаміў, што ў Крупках сёлета пачнецца будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчага комплексу.

У Лагойску ў цэрквах і касцёле прагучала малітва за Беларусь. У гарадскім парку працавалі тэматычныя пляцоўкі прадпрыемстваў і арганізацый раёна, сельсаветаў. Прайшло ўрачыстае ўзнагароджанне найлепшых працаўнікоў раёна. Святочныя мерапрыемствы адбыліся ва ўсіх 22 раёнах Міншчыны і горадзе Жодзіне.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,
Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,
Наталля КАПРЫЛЕНКА,
Маргарыта УШКЕВІЧ,
Нэллі ЗІГУЛЯ,
Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**